№ 198 (2011)
Чацвер, 21 кастрычніка 2004 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць —
5 разоў у тыдзень
Выдавец:
УП «Народная воля»

Кошт свабодны.

Народная Воля

На прастор, на шырокі разлог
Выходзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

E-mail: nv@promedia.by
http://nv.promedia.by

Надвор'е

У Мінску сёння ўдзень чакаецца — +5...+7, сонечна, унача — +3...+5, без ападкаў; у Брэсце ўдзень — +7...+9, без ападкаў, унача — +7...+9, дождж; у Гродне ўдзень — +6...+8, без ападкаў, унача — +6...+8, дождж; у Віцебску ўдзень — +6...+8, сонечна, унача — +3...+5, без ападкаў; у Гомелі ўдзень — +5...+7, сонечна, унача — +2...+4, без ападкаў; у Магілёве ўдзень — +6...+8, сонечна, унача — +2...+4, без ападкаў.

www.meteo.by

Расправа

На лідэра Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоля Лябедзьку ўчынена сапраўднае паляванне. Моцна збіты, з гематомай ныркі, страсеннем мазгоў і пераломам рэбраў Лябедзька дастаўлены ў Бальніцу хуткай дапамогі.

19 кастрычніка цэнтр Мінска нагадваў месца баявых дзеянняў. Яшчэ за некалькі гадзін да пачатку акцыі пратэсту супраць таго, што рэферэндум улады правялі пры поўным беззаконні, да Кастрычніцкай плошчы прыбыла каля дзесяці аўтобусаў з АМАПам. Міліцэйскія машыны акружылі плошчу з усіх бакоў. Было зразумела, што сілавыя структуры настроены рашуча. Як, уласна кажучы, і пратэстуючыя.

"Паважаныя грамадзяне, несанкцыянаваны мітынг на Кастрычніцкай плошчы забаронены, перакануча просім вас разысціся! У выпадку невыканання нашых патрабаванняў у адносінах да вас, магчыма, будзе ўжыта фізічная сіла", — папярэджвалі праз гукаўзмацняльнік міліцыянты. Лідэры апазіцыі і дэманстранты на падобныя заклікі ўвагі не звярталі.

"Мы павінны рыхтавацца не да нейкіх міфічных выбараў, а да самай сур'ёзнай барацьбы!" — эмацыянальна прамовіў Павел Севярынец. *"Канешне, можа, беларусы не гатовы зараз арганізавана выйсці на вуліцы, не гатовы да вызвольнага супраціву, але сказаць "не!" у гэтых умовах вельмі важна. "Не!", якое сказалі беларусы 17 кастрычніка, адрасавана не толькі персанальна Лукашэнку, гэта "не!" прыніжэнню беларускай нацыі!"* — звярнуўся да прысутных Сяржук Высоцкі. Калона пад кіраўніцтвам Паўла Севярынца выйшла на праезную частку і накіравалася да рэзідэнцыі прэзідэнта...

Шлях перакрыў АМАП. Пачалася жорсткая бойка. Зрэшты, было б наіўным меркаваць, што дэманстрантаў да "Чырвонага дома" прапусцяць. Таму людзі, якія выйшлі 19 кастрычніка на несанкцыянаваны мітынг, загадзя ведалі, што рызыкуюць сваім жыццём. *"Але ў нас няма іншага выйсця"*, — казала моладзь. Сутыкненне паміж амапаўцамі і дэманстрантамі выклікала сапраўдны шок у журналістаў і міжнародных назіральнікаў. *"Щас мы вас тут всех порвем!"* — роў "камуфляжнік" з шалёнымі вачыма. Польскія СМІ паспелі зняць момант, як катавалі адзінаццацігадовае дзіцятка. Хлопчыка адарвалі ад маці, паднялі за вопратку і груба кінулі ў аўтобус... *"Мабыць, уяўляў самую вялікую небяспеку для дзяржавы"*, — сумна выказаўся хтосьці з журналістаў.

Лідэры калоны, у тым ліку Павел Севярынец, былі схоплены адны́мі з першых. Сярод затрыманых і фотакарэспандэнт "Асашыэйтэд Прэс" Сяргей Грыц. Трэба зазначыць, што з журналістамі ў гэты дзень наогул не цырымоніліся — недатыкальнасць не распаўсюджвалася ні на каго. У аўтобус спрабавалі зацягнуць і назіральніка з Даніі, але, пачуўшы, што той размаўляе не "по-русски", адпусцілі.

Далейшыя падзеі разгортваліся проста па вар'яцкім сцэнарыі. Лідэра АГП Анатоля Лябедзьку ўзялі ў шчыльнае кола хлопцы ў чорных скуранках. Лябедзька, наважыўшыся адарвацца ад "хваста", забег у кафэ, што побач з плошчай. Людзі ў цывільным рвануліся за ім, дзверы ў кафэ заблакіравалі. *"Выпусціце чалавека, сволачы!"* — крычаў натоўп. Тым часам праз чорны ўваход у кафэ былі запушчаны байцы АМАПа... Анатоля Лябедзьку павалілі на падлогу і на вачах шматлікіх сведкаў пачалі збіваць нагамі. Журналісты НТБ і аператар RenTV, якім удалося прасачыцца ў памяшканне, таксама трапілі пад раздачу. *"Мы зайшлі ў фае, на нас выскачыў АМАП, усіх прыціснулі да сцяны, пасля павалілі на падлогу. Білі нагамі па камеры, нагамі па целу, хто — я не бачыў, памятаю толькі, што з намі было яшчэ чалавек 5—6"*, — распавёў аператар НТБ Канстанцін Марозаў, выціраючы кроў з ілба.

Усе затрыманыя былі дастаўлены ў Ленінскае РУУС. Усяго, па інфармацыі праваабаронцаў, арыштавана каля 50 чалавек, асноўная частка — актывісты незарэгістраваных "Маладога фронту" і "Зубра", ёсць непаўнагадовыя. Два чалавекі, па інфармацыі беларускай службы Радыё Свабода, знаходзяцца ў 5-м клінічным шпіталі. Моцна збітаму Анатолю Лябедзьку супрацоўнікі РУУСа выклікалі "хуткую". Прадстаўнікі мас-медыя, у тым ліку міжнародных, якія прыехалі да сцен пастарунка, на ўласныя вочы пераканаліся, у якім стане знаходзіўся лідэр АГП. У суправаджэнні міліцыі Лябедзьку ў рэшце рэшт адвезлі ў Бальніцу хуткай дапамогі. Дарэчы, кіраўнік місіі АБСЕ ў Беларусі Эберхард Хайкен, які прыехаў у Ленінскае РУУС, у будынак дапушчаны не быў.

З Анатолем Лябедзькам мы звязаліся наступнай раніцай:

— Як Вы сябе адчуваеце?

— Зараз ужо крыху лепш. Тое, што адбылося на акцыі, акрамя як паляваннем на людзей ахарактарызаваць не магу. Не ведаю, мабыць, службоўцы хацелі паказаць сваю перавагу, калі збівалі мяне на вачах усяго персаналу кафэ, калі ў кайданках падымалі ўверх і асабіста кіраўнік АМАПа Падабед з асалодай біў мяне ў твар. Яны думалі мяне прынізіць, але гэтымі дзеяннямі паказалі толькі сваю слабасць.

Учора пачаліся суды над затрыманымі. Павел Севярынец атрымаў 15 сутак арышту, Мікола Статкевіч — 10.

Вольга КЛАСКОЎСКАЯ.
Фота photo.bymedia.net

ГРОМКОЕ ДЕЛО

Шеремет свободен. Пока...

20 октября в суде Советского района Минска должен был состояться суд по делу журналиста Павла Шеремета.

Павел, собираясь в суд, взял с собой теплые вещи. На случай, если его признают виновным и отправят в места не столь отдаленные.

Однако суда не было. Как оказалось, милиция не передала в суд никаких документов. Шеремету сказали, что он свободен. Пока...

Адвокат **Вера Стремковская** говорит, что на протяжении двух месяцев документы могут быть переданы в суд и рассмотрены в любой момент.

"Вчера поддержать Павла пришло большое количество людей: журналисты, дипломаты, общественные деятели, — говорит Вера Валентиновна. — Если бы суд состоялся, он получил бы огромный резонанс. А отдельные персоны в этом не заинтересованы..."

Шеремет обвиняется по статье "мелкое хулиганство" Административного кодекса Республики Беларусь. В случае, если бы журналиста признали виновным, ему грозил бы денежный штраф или 15 суток ареста.

Даша ПАВЛОВСКАЯ.

Х.Салана крытыкуе рэферэндум і выбары ў Беларусі

Вярхоўны прадстаўнік Еўрасаюза па адзінай знешняй палітыцы і бяспецы Хаўер Салана выказаў занепакоенасць "сур'ёзнымі парушэннямі", якія былі выкладзены ў дакладзе аб выніках назірання экспертаў Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека (БДІПЧ) АБСЕ за ходам парламенцкіх выбараў у Беларусі, паведамляе інфармацыйнае агенцтва "Рэйтэр".

"Для мяне відавочна, што гэтыя выбары не былі ні свабоднымі, ні справядлівымі", — заявіў Х.Салана. Нягледзячы на тое, што "працэс арганізацыі галасавання цалкам не адпавядаў чаканням Еўрасаюза і АБСЕ", Х.Салана выказаў задавальненне высокай яўкай выбаршчыкаў. Гэтым, на думку Еўрасаюза, беларускія грамадзяне прадэманстравалі "сваю прыхільнасць да стварэння ў Беларусі палітычнага плюралізму".

Кіраўнік прадстаўнікоў ліберальных партый у Еўрапарламенце Грэхэм Уотсан назваў беларускі рэферэндум "сумным вяртаннем да метадаў Савецкага Саюза".

Марына РАХЛЕЙ.

НЕЛЬГА МАЎЧАЦЬ

Не веру!

Я не веру ў праўдзівасць лічбаў, занесенных у пратакол Жаннай Шкамплетавай і Аляксандрам Лапо

Сваю назіральніцкую працу на выбарчым участку № 111 Магілёўскай-Кастрычніцкай выбарчай акругі я пачаў недзе а семнаццатай гадзіне. Ён месціўся ў пакойчыку, які пры саветах называўся "ленкомнатой", рабочага інтэрната аб'яднання "Хімвалакно". Члены камісіі сядзелі задаволеныя — выбары адбыліся, народ не праігнараваў. "Ужо 58 працэнтаў прагаласавала", — паведаміў на мой запыт намеснік старшыні камісіі.

"Камісары" былі ў гуморы, там-сям гучалі жарты. Судзячы па тым, што адносіны паміж "камісарамі" былі досыць свойскімі, гаманілі пра хатнія справы, называлі адзін аднаго па-панібрацку — Міхайлавіч, Сяргееўна, — я зрабіў выснову, што ці не ўсе яны з аднаго прадпрыемства.

Са старшынёй А.Лапо і сакратаркай Ж.Шкамплетавай пазнаёміўся яшчэ напярэдадні, калі прынёс вынятку з пратакола аб накіраванні мяне назіральнікам. Тыя доўга круцілі паперчыну, запатрабавалі пашпарт, але, не знайшоўшы, да чаго прычапіцца, зафіксавалі маё прозвішча ў спісе назіральнікаў, панаракаўшы, што назіральнікаў на ўчастку аж занадта. Сакратарка, маладая жанчына з залатымі ўпрыгожваннямі на палове пальцаў і на шыі, здзіўлена паглядала на мяне. Мабыць, упершыню бачыла жывога бэнээфаўца.

Назіральнікаў пяцёра. Знаёмлюся. Акрамя мяне, прадстаўнік ПКБ і... трое назіральнікаў з таго ж прадпрыемства, што і камісія (маладыя мужчыны і жанчына ў гадах Ніна Уладзіміраўна). Вось такое "самаабслугоўванне". Успамінаю нараканне Лапо: "назіральнікаў аж занадта". У тэатры такое называецца "клака".

Прыступаю да назіральніцкіх абавязкаў. Людзі заходзяць, бяруць па пашпартах бюлетэні, галасуюць. Усё, як трэба. Назіральнікі сумуюць. Ніна Уладзіміраўна гатовая, здаецца, крыху паспаць. Цікаўлюся, ці знаёмая яна з Выбарчым кодэксам. "Ну... знаёма..." — няўпэўнена кажа яна. "І што вы будзеце рабіць, калі ўбачыце якое парушэнне?" — "Ну якія тут могуць быць парушэнні?" — ухіляецца яна ад майго пытання.

Падыходжу да сакратаркі, цікаўлюся лічбамі — колькі выбаршчыкаў на ўчастку па спісах і колькі прагаласавалі датэрмінова. На першае пытанне адказала: 2345, на другое — не, маўляў, яшчэ не падлічылі. Пытаюся пра тое ж у старшыні. Спадар Лапо паўтарае версію "не падлічылі". Я заўважаю, што падлічыць ужо павінны былі, бо інфармацыя павінна была давацца наверх, і прашу назваць хаця б прыблізную колькасць. "Каля трохсот", — неахвотна выціскае Лапо. Пытаюся пра колькасць бюлетэняў, якія атрымала камісія. Сакратарка робіць выгляд, што не пачула пытання. Паўтараю пытанне другі і трэці раз. Сакратарка маўчыць, як той юнак на допыце. Я стаю побач, чакаю. Нарэшце яна "заўважае" мяне: "Ну што вы хочаце?" — "Колькі бюлетэняў?" — "Столькі, колькі і выбаршчыкаў" *(з раздражненнем)*. — "Значыць, 2345?" — "Так". — "Але ж звычайна даюць крыху пра запас, на выпадак, калі прыйдзе хтосьці, не ўнесены ў спісы". — "Не, нам даюць дакладна".

Саджуся на месца, якое адведзена назіральнікам. З гэтага месца відаць камісію, якая выдае бюлетэні, відаць, як людзі заходзяць у кабінкі, але выходзяць з кабінак яны ўжо ў другі бок, дзе стаіць скрыня. Што яны кідаюць у скрыню, назіральнікам не бачна. Побач са скрыняй стол, за якім сядзіць сакратарка. Гэтага стала назіральнікам таксама за кабінкамі не бачна, і дзейнасць сакратаркі застаецца для іх таямніцай. Але, мабыць, ніхто, акрамя мяне, гэтай дзейнасцю і не цікавіцца.

Пры мне на ўчастку прагаласавалі некалькі дзесяткаў выбаршчыкаў. Я ўспамінаю пра ранейшыя 58 працэнтаў і прыкідваю, што на ўчастку прагаласавала недзе паміж 60 і 70 працэнтамі.

...Час галасавання заканчваецца. А дваццатай гадзіне вечара старшыня склікае камісію, яны ссоўваюць сталы і падлічваюць спачатку нявыкарыстаныя бюлетэні, абразаючы нажніцамі вугалкі. Калі гэтыя бюлетэні пачынаюць запакоўваць, я цікаўлюся атрыманай лічбай. "Не перашкаджайце працаваць, — раздражнёна адмахваецца старшыня, — усю інфармацыю атрымаеце потым". — "Але ж гэтая лічба ўжо ёсць. Чаму б яе не назваць?" Старшыня маўчыць.

Падлічылі галасы са скрыні для датэрміновага галасавання. Цікаўны назіральнік "са сваіх" падыходзіць бліжэй, каб бачыць, што робіцца, але старшыня прапануе яму адысці далей. Мяркуючы, мабыць, што не трэба даваць такім, як я, "дурны прыклад". Трое назіральнікаў стаяць на адлегласці метра паўтара за спінамі "камісараў", двое сядзяць на крэслах і клююць носам. Вынікі датэрміновага галасавання зноў жа не абвяшчаюцца. "Потым, потым", — адмахваецца Лапо.

Паднеслі тры меншыя скрыні, з якімі ездзілі па дамах. Бюлетэняў у скрынях аказалася надзіва шмат — лічба будзе трохзначнай. Назіральнік ад ПКБ здзіўляецца, калі ж яны ездзілі, што ён не бачыў. Аказваецца, ездзіць пачалі з дзевяці гадзін раніцы. Назіральнікаў не запрашалі. Сакратарка на калькулятары падсумоўвае колькасць тых, хто прагаласаваў. Я мімаходзь падглядваю апошні лік: 670. Значыць, па дамах назбіралі аж трыста галасоў. Вось такі ўлоў! Як шмат у нас нямоглых, што прагнуць паўдзельнічаць у кіраванні дзяржавай!

Нарэшце вывальваюць бюлетэні з галоўнай скрыні. Пачынаюць іх раскладваць. Я сачу за пачкамі "за" і "супраць" па рэферэндуме. Пачак "за" расце хутчэй, у выніку ён недзе ўтрая таўсцейшы за пачак "супраць". Выніковыя лічбы называюцца напаўголасу, каб назіральнікі не чулі. Сакратарку, якая занатоўвае лічбы, закрываюць ззаду сваімі целамі старшыня і яго намеснік. Ніякай інфармацыі назіральнікам не паведамляецца. "Потым, потым..."

Пакой невялікі і робіцца душна. Раздаецца храп. Гэта нарэшце заснула Ніна Уладзіміраўна, але спахапілася і робіць выгляд, што сочыць з крэсла за спінамі "камісараў". Але хутка яе цікавасць знікае і на твары з'яўляецца звыклая абыякавасць.

За вакном чуецца нейкі выбух. Хтосьці жартуе: "Вось ужо салютуюць перамогу". Шум у калідоры. Стукае ў дзверы вахцёрка: "Ігнатаўна, выйдзі!" Ігнатаўна, жвавая, баявітая жанчына, загадчыца гэтага ж інтэрната (называе сябе па-ранейшаму — камендант), падыходзіць да дзвярэй і пытае, што здарылася. "Дзяруцца!" — "Выклікай міліцыю. Я не магу выйсці. Ідзе падлік галасоў". — "Ужо выклікалі." — "Хай забіраюць. Усё. Не турбуйце мяне!"

Праз колькі хвілін у калідоры шум і звон пабітага шкла. Ігнатаўна пераглядваецца з калегамі-"камісарамі": "Люстра пабілі!" Але махае рукой і працягвае лічыць паперкі.

Заўважаю, што сярод назіральнікаў папаўненне. Знаёмлюся. Сняжана, прадстаўніца райвыканкама (ці, як цяпер кажуць, адміністрацыі), з мабільнікам. Той меладычна нагадвае пра сябе. Раённую адміністрацыю цікавіць, ці хутка скончыцца падлік галасоў. "Хутка", — абяцае іх прадстаўніца.

А камісія ўзбуджана абмяркоўвае неспадзяванку. У клетцы "за" пастаўлены нязвыклы знак (ці не дуля?). Вырашаюць, што любы знак у гэтай клетцы ёсць голас "за". Але хутка новая неспадзяванка: у той жа клетцы нецэнзурнае слова з трох літар. Хтосьці прапануе і гэта лічыць голасам "за", але большасць пратэстуе — "гэта абраза!". Бюлетэнь адкладваецца ў стос несапраўдных.

Урэшце падлік галасоў закончаны. Раскладзеныя стосы бюлетэняў пакуюцца ў пачкі, якія апячатваюць... пластылінам. Я ўяўляю, што будзе з такой пячаткай, калі пачкі пакласці адзін на адзін. Але відавочна — пра надзейнасць тых пячатак ніхто не турбуецца.

Сакратарка і старшыня ідуць за кабінкі (асобна ад камісіі!) пісаць пратакол. Я скіроўваюся за імі. "А вы куды?" — здзіўляецца Лапо. "Я назіральнік. Іду назіраць." — "Не, вам сюды нельга. Ідзіце, сядзьце, дзе ўсе назіральнікі, і чакайце". — "Выбачайце, — мякка пратэстую я. — Але адтуль мне не бачна, што вы робіце". — "Вось я ж вас паважаю, я вас прыняў як назіральніка, а вы..." — крыўдзіцца старшыня. "Я вас таксама паважаю, — супакойваю я крыўду старшыні. — Але я назіральнік і буду назіраць". — "Вы нам перашкаджаеце!" — "Не, я не перашкаджаю. Выконвайце сваю працу..." Наш "абмен думкамі" зацягваецца. "Не трэба канфліктаў!" — хвалюецца назіральнік ад ПКБ, робячы колькі крокаў у наш бок.

Бачачы, што я не збіраюся сыходзіць за кабінкі, сакратарка пачынае пераносіць у пратакол лічбы з нейкай паперкі, а старшыня сваім целам закрывае яе ад мяне. Я заўважаю, што пратакол ужо загадзя падпісаны членамі камісіі. Не хапала трох подпісаў, і сакратарка запрасіла трох "камісараў" распісацца. Тыя зрабілі гэта, не чытаючы пратакола.

Зноў тэлефануюць з адміністрацыі. "Ужо едзем!" Сакратарка ўстае, збірае паперы, але я нагадваю пра копію пратакола, якую трэба павесіць для агульнага азнаямлення. Скапіраваць пратакол няма на чым, капіравальнай тэхнікі ў інтэрнаце няма. І другога бланка пратакола для запаўнення не знаходзіцца. Намеснік старшыні раіць напісаць копію пратакола ад рукі на звычайным аркушы. Але і чыстага аркуша няма. Сакратарка рве лісток са сшытка. Я працягваю ёй чысты аркуш са сваіх запасаў. Яна пачынае пісаць, але бачыць, што гэта зойме немалы час, а прагучала ж "Ужо едзем!". І прапануе: давайце я прадыктую, што вам трэба. Што ж, нарэшце пойдзе нейкая інфармацыя. Я запісваю лічбы па выбарах. Назваўшы апошнюю, яна рэзка ўстае і з паперамі накіроўваецца да дзвярэй, дзе яе нецярпліва чакае старшыня. "Хвіліначку! — спыняю я яе імклівасць. — А лічбы рэферэндуму?" Яна на хаду заглядвае ў паперы і скарагаворкай прамаўляе: "1930 "за", 135 "супраць", 15 несапраўдных". Пакуль я ўсведамляю пачутае, кіраўніцтва камісіі знікае за дзвярыма. Асірацелая камісія з цікавасцю паглядае на мяне. "Пачакайце, — не магу я стрымаць сваёй збянтэжанасці. — Як жа так! Я ж бачыў стосы "за" і "супраць". Яны былі рознымі, але ж не настолькі!" — "І мы бачылі, — уключаецца ў размову адна з "камісарак". — Стос "супраць" складаў недзе трэцюю частку ад стоса "за". — "Вось-вось, — пагаджаюся я. — Галасоў "за" было прыблізна ўтрая болей. Ну няхай нават у чатыры ці пяць разоў. Але ж не ў пятнаццаць!" Але мае сумненні выклікаюць у "камісараў" толькі ўсмешкі. Яны пачынаюць тлумачыць мне пра памылкі візуальнага ўспрыняцця. Потым нехта гаворыць: "Калі вы сумняваецеся, то гэта ж можна праверыць". — "Як? — цікаўлюся я. — Ехаць у райвыканкам, каб пералічыць? Але ж там ужо будзе пачак з патрэбнай колькасцю, як у пратаколе".

Падлічваю працэнт тых, хто прагаласаваў. Атрымліваецца 89. І тут сюрпрыз! 20—25 працэнтаў звыш рэальнай лічбы.

Ішоў дадому з адчуваннем, нібыта мяне нахабна абрабавалі. І зараз павінен заявіць: **я не веру ў праўдзівасць лічбаў, занесеных у пратакол Жанай Шкамплетавай і Аляксандрам Лапо.**

Я не веру таксама ў тое, што раённую адміністрацыю цікавілі сапраўдныя лічбы рэферэндуму. Інакш яны далі б камісіі дакладна ўсё падлічыць і пераправерыць, не падганяючы "хутчэй-хутчэй". З такой імклівасцю робяць толькі нешта заганнае, як бы — украсці ды збегчы, каб не ўбачылі. Такім чынам, я не веру ў тое, што "народ падтрымаў".

Назаўтра мяне "супакоіў" Алесь, знаёмы. На ўчастку, на якім назіраў ён, лічбы аказаліся яшчэ больш далёкімі ад праўды. Хаця, здавалася, куды ўжо больш!

Хлусня пранікае наша грамадства наскрозь. Хлусня, ад якой не ўцячы, не схавацца. Як жыць, людзі?

Міхась БУЛАВАЦКІ,
назіральнік.

Нужен ли нам российский рубль?

Или Новые нюансы старой темы

На недавней пресс-конференции с участием журналистов российских регионов президент Беларуси Александр Лукашенко высказал свое мнение по поводу отношений с Россией и, в частности, вернулся к планам по созданию единой валюты. Глава государства считает, что в последнее время белорусский рубль укрепился, а следовательно, не имеет смысла отказываться от своей валюты.

"Впервые за новую историю белорусский рубль укрепляется по отношению к иностранным валютам, в том числе к доллару и российскому рублю", — считает Александр Лукашенко. Президент подчеркнул: "При том, что мы покупаем энергоносители по бешеным ценам, мы создали нормальные золотовалютные резервы. Люди заинтересованы держать свои сбережения в белорусской валюте. Сегодня спрос на нее гораздо выше, чем на российский рубль, доллар или евро".

В связи с этим Лукашенко пришел к выводу, что от белорусского рубля отказываться не стоит: "Все готово для того, чтобы перейти на единое платежное средство. Но мы себя сегодня комфортно чувствуем с белорусским рублем. Если нормально, то зачем выбрасывать этот инструмент, какой смысл идти на какую-то ломку?"

Александра Лукашенко также беспокоит то, что надо переходить не на новую общую валюту, а на российский рубль. По мнению президента, к введению общей валюты не готова Россия."Общая валюта — это не белорусский и не российский рубль. Россия никогда не откажется от российского рубля во имя какой-то общей валюты. То есть мы опять отходим от Договора о создании Союзного государства, который мы когда-то подписали", — считает Лукашенко.

Как известно, переход на единую валюту является одним из наиболее проблемных вопросов белорусско-российской интеграции. В то время как Москва настаивает на переходе нашей страны на российский рубль, Минск не торопится идти на этот шаг.

В прошлом году белорусская сторона выдвинула ряд предварительных условий, которые, по ее мнению, должны быть выполнены до перехода на российский рубль. Речь идет о создании равных условий для предприятий и граждан двух стран, выплате компенсации по косвенным налогам, отмене таможенного контроля со стороны России на совместной границе и ряде других шагов.

Весной этого года представители обеих сторон стали делать заявления о том, что переход Беларуси на российский рубль в запланированный срок (то есть с 1 января 2005 года) вряд ли возможен. А в июле Александр Лукашенко заявил о том, что два вопроса — о переходе Беларуси на российский рубль и о принятии Конституционного акта Союзного государства — выносятся за скобки интеграции. Впрочем, главы России и Беларуси вернулись к этим вопросам достаточно быстро.

На встрече Александра Лукашенко и Владимира Путина, которая состоялась в августе этого года в Сочи, снова обсуждался вопрос о переходе на российский рубль. Стороны заявили, что он может быть осуществлен с 1 января 2006 года. Впрочем, у них не было полной уверенности в том, что это произойдет именно в этот срок.

Независимые эксперты согласны с тем, что Беларуси не стоит торопиться с переходом на российский рубль. В частности, экс-председатель правления Нацбанка Станислав Богданкевич ранее говорил о том, что необходимо провести экономические реформы — и лишь потом думать о создании каких бы то ни было валютных союзов.

Мария ФЕДОРОВА.
("Белорусские новости".)

АНОНС

Выборы, референдум и старики



Все — позади.

Остается только одно: думать и действовать.

Думать, анализируя причины белорусского бедствия.

Действовать, корректируя тактику оппозиционного движения.

*Сегодня это начинает известный публицист **Анатолий КОЗЛОВИЧ** (смотрите вторую страницу «Народной воли»).*

Автор предлагает свою трактовку того, что произошло в Беларуси в октябре 2004 года: к «победе» Лукашенко привели, с одной стороны, грубейшие нарушения законов властью, ее избирательными комиссиями, с другой — слепота стариков.

В этой публикации свое внимание журналист сосредоточил на стариках.

Влодимеж ЦИМОШЕВИЧ:

Выборы и референдум в Беларуси не соответствовали демократическим стандартам

Министр иностранных дел Польши Влодимеж Цимошевич считает, что состоявшиеся выборы и референдум в Беларуси не соответствовали всем демократическим стандартам. По его мнению, прошедшие выборы и референдум осложнят отношения между нашими странами. Глава внешнеполитического ведомства сказал, что Польша, как и прежде, будет, с одной стороны, поддерживать тех, кто выступает за демократическую Беларусь, а с другой — привлекать польских партнеров во всем мире, чтобы они не забывали о Беларуси.

Народная Воля 21 КАСТРЫЧНІКА 2004 г.

БЕЛОРУСЫ МЕЖДУ НЕБОМ И ЗЕМЛЕЙ

Хроники Анатолия Козловича

Сегодня для Беларуси нет важнее вопроса: как проголосовали на "ошеломившем" (президента) референдуме 2004 года молодые? Солдат и студентов силой и хитростью гнали на досрочное голосование, но в кабинках-то никто рядом с ними не стоял. Молодые сделали самостоятельный выбор. Какой же? Моя хроника это зафиксировала. Призываю к серьезному разговору о причинах и последствиях побед и поражений противоборствующих сторон на референдуме. Разговоры о нарушениях властями избирательных процедур, на чем сосредоточено внимание оппозиции, — это глас вопиющего в пустыне, переходящий в демагогию. Признать полное поражение многолетней тактики у профессиональных оппозиционеров не хватает мужества, ответственности, ума. Может быть, молодежь подскажет им, что делать дальше?

Белдомострой

Ровно за один месяц до республиканского референдума я попросил молодых современников — студентов, рабочих, предпринимателей — написать для меня сочинение-эссе на тему "17 октября 2004 года". Ребятам от 20 до 25 лет. Всех я знаю достаточно хорошо, они знают меня, читали мои книги. Взаимное доверие способствовало искренности нашего общения, из искренности вытекает больше объективности, чем из безликих исследований социологов.

Я обещал юным сочинителям анонимность авторства, неизменность их стиля и логики. От них просил одного: постараться словами как можно точнее выразить то, что они переживают, чувствуют по поводу предстоящего референдума. Если бы я попросил об этом после голосования, то, думаю, мои респонденты не смогли бы оставаться самими собой, ибо несогласные ощущали бы психологическое давление уже состоявшегося выбора народа. Эссе родились бы несвободными, следовательно, никчемными как основа для выводов.

Сегодня результаты референдума 2004 года известны: президенту Республики Беларусь Александру Лукашенко белорусский народ "разрешил участвовать" в президентских выборах 2006 года. Хоть "разрешил", то изберет его на третий срок. Если изберет на третий, то и на четвертый. А там, если позволит здоровье всенародно избранного и вечного, и пятый срок возникнет как фатальная неизбежность диктатуры, исключающей всякие выборы.

Референдум-2004 определил перспективу развития Беларуси на длительный период, его истинные последствия скажутся тогда, когда основная часть нынешнего электората Лукашенко уйдет в мир иной. 17 октября 2004 года родители выбрали судьбу своим детям и внукам. Нравственно важно знать, что думают по этому поводу молодые. Если мы будем знать, что именно они думают, мы сможем прогнозировать, что конкретно они сделают, как распорядятся навязанными судьбами. В мыслях и чувствах нынешних молодых непременно присутствует будущее Беларуси.

***

Ирина Д.:

"Уже совсем скоро придет тот день, который мы так ждем - 17 октября 2004 года станет днем перелома для белорусского народа. Главная задача — сделать выбор. Выбор — правильный.

Белорусов на данный момент волнует вопрос о третьем сроке нашего президента. Правильно ли сделает народ, дав ему еще один шанс?

Что мы имеем на сегодняшний день? Маленькая зарплата, безработица, отсутствие полной свободы слова. Хочется лучшей жизни. Но как открыть глаза родным белорусам? Как сделать так, чтобы народ не участвовал в уничтожении нашей страны? Поднимите глаза, люди, загляните в будущее! Введут российский рубль, зарплаты начнут не платить, цены на коммунальные услуги резко повысятся. Делается страшно за наш народ, если он избирает такое будущее.

Конечно, не раз приходилось слышать и хорошие отзывы о теперешнем президенте, но все они однообразны. Посмотрите вы только на дороги, на них так приятно ездить! Гляньте на Минск, который летом так красив: убраны улицы, разбиты цветники. Да и пенсия вроде бы увеличивается. А что будет с нами с другим будущим президентом? Вдруг будет разрушено все то, что мы достигли при Лукашенко?

Что же думает по этому поводу наша молодежь? Слова и аргументы те же, что у взрослых. Одни с гордостью показывают на спортивные комплексы и новую национальную библиотеку, а другие говорят: это все, на что способен Лукашенко.

По-моему, жизнь лучше не стала. Библиотека отдельно, жизнь отдельно. Чтобы прокормить себя, люди вынуждены искать приработок. Если нет возможности найти работу здесь, то приходится уезжать за границу. Или оставаться в стране, ограничивать себя в еде и одежде, и жить в самом необходимом. Разве это нормальная жизнь?

Страх, страх, и только — вот что ждет нас в нашей стране".

***

Елена П.:

"Выхожу одна я на дорогу. Плакаты, листовки, огромные стенды агитируют за референдум. Текущие реки золотого зерна, а на их фоне натруженные крестьянские руки и надпись: "За родную Беларусь!" А лицо где? Эти руки без лица. Не нужно оно. У нас миллионы безликих работяг. По телевизору же покажут сытненьких актеров, неумело влезших на комбайн, предварительно очищенный от многолетней грязи, улыбающихся, хлопающих друг друга по плечу со словами: "Батька не подведет!" Руки подлинного крестьянина, да и вообще большей доли людей — все на одно лицо. Судьбу Беларуси на референдуме 17 октября 2004 года решит белорусский [illegible]".

***

Ирина Г.:

"Сегодня стало модным кричать о демократии, о правах человека, о свободе слова. Парадоксально, но когда надо сделать выбор, белорусы предпочитают страусиную тактику. В чем дело?

Ответ на этот вопрос я получила в лифте, где прочитала выцарапанное изречение: "Голосуй не голосуй — все равно получишь х...".

Чем, скажите, не оправдание проигнорировать политику Лукашенко? А ведь референдум дает каждому белорусу сделать правильный выбор. Никто не будет стоять рядом в кабинке для голосования. Только они свидетели — ответственность.

Сегодня, за месяц до референдума, я с тревогой думаю: покажет ли наш народ, что у него есть свой голос, что он осознает свое право его иметь, что он может решать и выбирать и что он достоин это делать? Я могу сказать, что ни вера в фатальную неизбежность фальсификации результатов референдума, ни неверие в силы оппозиционных политиков изменить что-либо к лучшему — ничто не может оправдать безучастность миллионов людей к своей судьбе, к судьбе своих детей".

***

Людмила Щ.:

"В троллейбусе рядом с моим ухом одна тетка говорила другой: "Вчера весь вечер слушала, слушала по телевизору батьку. Ну, молодец! Вот с кого пример молодежи брать. Дай Бог ему здоровья еще лет на 30, тогда и помереть можно спокойно".

Мне стало страшно. Эти две тетки уже определили мне будущее на 30 лет вперед. Даже нам, не родившимся еще, они выбрали жизнь под диктатурой Лукашенко. Страшно! Неужели так легко купить волю народа за бесплатные городские праздники, за строящиеся библиотеки? Хочется кричать от злости, чтобы разбудить окутанных гипнозом людей: я не буду жить в мире, созданном вами!"

***

Валентин Т.:

"Уже десять лет минуло, как на пост президента Беларуси взошел А.Г.Лукашенко. Он проделал немало работы по улучшению социальной жизни страны. Жизнь стала более "вкусной". Но сегодня следует спросить: а могли ли быть лучше? Ответ на этот вопрос каждый здравомыслящий человек дает однозначно: да, могли.

Первый президент Беларуси повел белорусов по знакомому старшему поколению советскому пути, где личная инициатива наказуема, где нигде нет свободы, где [illegible] правящая партия.

Сегодня, когда до голосования по известному всем вопросу осталось ровно месяц, белорусскому народу пора сделать, пожалуй, самый важный выбор в истории суверенной Беларуси. Хорошо подумайте, белорусы, целый месяц, если еще не потеряли дар думать, настроенные на национальное телевидение. Подумайте, неужели предел мечтаний — это зарплата в 200 "зеленых" да обещания властей обеспечить малоимущих и молодые семьи? Ведь жизнь может быть гораздо лучше, свободнее. Успех и процветание Беларуси [illegible] частью молодежи, а значит и от желающего проголосовать 17 октября 2004 года освобождения от гипноза пропаганды и здраво подумать о судьбе своих детей, своей страны".

***

Лейла Ш.:

"Сидим с мамой перед телевизором. Показывают оппозиционный митинг в Минске, где требуют отставки Лукашенко. Мама говорит мне: "Какой кошмар, какое несчастье! Если они победят, они прогонят нас из Беларуси". Успокаиваю ее: "Не бойся, с нами такого не случится. Мы живем в тихой и мирной стране. Лукашенко не допустит беспредела". — "Да! — подхватывает мама. — Он же нам, как отец родной. Он любит нас, заботится, как о родных детях. Чего этим оппозиционерам еще надо?"

Мы — лезгины, приехали в Беларусь из Дагестана, живем при Лукашенко десять лет, ни разу не слышали упрека в том, что мы "лица кавказской национальности". Но я не могу понять белорусов. Спорила с одной девушкой, хорошей знакомой. Она, белоруска, ненавидит белорусский язык, клянется, что никогда не заговорит на нем. А меня, когда я приезжаю в Дагестан, родные порою упрекают в том, что не знаю родного языка. Меня очень удивляет, когда в разговорах на родине постоянно слышу один и тот же вопрос: "Это правда, что Лукашенко такой тиран, как о нем пишут?" С жаром опровергаю. Рассказываю о красивой стране, где нет войны, где строятся дворцы спорта и библиотеки, где проводятся городские праздники. Мы бросили свою Родину, чтобы в Беларуси чувствовать себя в полной безопасности.

Белорусы видели много горя, но 60 мирных лет воспитали поколение, которому просто жить в мире — уже мало. Молодые люди не видели взрывов, не голодали, не наделены несчастьем беженцев. Они слышали о сытой жизни в других странах, им хочется жить так же, и потому они возмущаются Беларусью и ее строем. Мой папа говорит так: "Когда к власти придет какой-нибудь "зубр" и заставит всех говорить по-белорусски, здесь начнется война, как в Дагестане, вот увидишь. И нам придется уезжать".

***

Ольга Р.:

"Я недавно спросила у одного молодого человека, который купил себе автомобиль за 100 тысяч долларов и трехкомнатную квартиру: "Пойдешь ли ты на референдум 17 0ктября?" Ответ его был удивительным: "Конечно, пойду! Хотя мой голос ничего не решит. Лучше в Беларуси не будет. Я против третьего срока президента, потому что с ним мне лучше жить не стало". Невольно напрашивается вопрос: а машина, а квартира?

Хорошо, конечно, что постоянно что-то не устраивает. Значит, надо стремиться к лучшему. Значит, нужны перемены. Значит, надо идти на референдум и выбирать лучшее. Давно пора определиться, спросить у себя: все ли хорошо в моей жизни при этой власти?

В моей семье лучше при Лукашенко действительно не стало".

***

Юлия Ш.:

"До самого яркого политического события современности, референдума 17 октября 2004 года, еще месяц, а я, впрочем, как и мои многочисленные друзья, уже бросила смотреть белорусское телевидение. Агитация и зомбирование напоминают представление "погорелого театра", которое наш народ насмотрелся при социализме. В представление вливаются огромные деньги, а моя мама как получала на государственном предприятии 90 долларов в месяц, так и получает. Пусть бы перед референдумом провели эксперимент над политиками и кандидатами в президенты: смогут ли они содержать свои семьи на такие деньги. Я без сомнений отдала бы свой голос тому, кто прошел бы такие испытания. Пусть бы сам решил: либо зарплата маленькая, либо мы зажрались?

Обещали нам счастливое будущее в 1994 году, затем на референдумах 1995-го и 1996-го, а мы роемся в мусорных бачках. На днях наблюдала на площади Якуба Коласа, как за 10 минут в одну и ту же мусорную урну заглянуло пять старушек. Искали пустые бутылки, чтобы за выручку от них поддержать свой семейный бюджет. Не это ли ярче всего говорит о "процветании" нашей страны? От счастливой ли жизни белорусские студенты так стремятся выехать за границу на летние каникулы, чтобы там драить полы, мыть посуду, танцевать стриптиз? Молодым хочется заработать свои деньги, чтобы стать независимыми от родителей.

Так стоит ли ждать каких-либо перемен после 17 октября? Стоит, если только надеяться на ... чудо".

***

Юлия М.:

"Я уже не задаюсь вопросом: что готовит день грядущий. Просто живу и пытаюсь верить в лучшее. Кого ни спроси, все за месяц до референдума знают ответ на вопрос: будет ли третий срок? Само собой разумеется, что он будет.

Смирившись с судьбой, мы ищем лучшее в мелочах, пытаемся не обращать внимания на буднично-бытовые трудности, из которых и состоит жизнь. Находим плюсы в обыденном, радуемся тому, что в более развитых странах считается нормой. Маленькая зарплата и пенсия выплачиваются каждый месяц — уже хорошо. Наши солдаты не воюют на чужих территориях — еще лучше. В холодильнике есть кефир, а в хлебнице батон — радость. Завтра не помрем от голода — прекрасно. Вот такой оптимист белорус. Когда нет возможности что-нибудь изменить, такой оптимизм спасает. И постепенно затихает в душе призыв Виктора Цоя: "Перемен требуют наши сердца. Перемен требуют наши глаза. И в наших висках, и в пульсации вен — перемен. Мы ждем перемен".

Перемен в Беларуси не видать. Было ли когда-нибудь в Беларуси хорошо — никто не знает, не помнит. И оттого молодым людям здесь очень-очень грустно, а пожилым — все равно".

***

Попросив ребят быть искренними и веря в их искренность, я и не намекнул, что хочу знать, как они проголосуют на референдуме. Неэтично было бы посягать на тайну их личного выбора. Однако, как видим, они не стали скрывать своих электоральных симпатий-антипатий, по настрою эссе можно достоверно судить, в каком квадратике избирательного бюллетеня молодые поставили "птички".

Мои юные современники единодушно ПРОТИВ курса президента Александра Лукашенко. Их политические исповеди — наиважнейший национальный документ начала 21 века: на республиканском референдуме 17 октября 2004 года белорусская молодежь, за редчайшим исключением, не разрешила Лукашенко переписывать под себя Конституцию, чтобы участвовать в президентских выборах 2006 года.

"Птичку" ЗА Лукашенко выпустила из смятенной души лезгинка Лейла Ш., однако ее политически некорректная аргументация лишь выпячивает правило и делает ярче правду: Лукашенко и будущее Беларуси — несовместимы. Именно эту правду накануне референдума остервенело насиловали национальные телеканалы, показывая беженцев и мигрантов, прибывших в Беларусь из Кавказа, Средней Азии, Молдовы и вразумляющих белорусов любить своего правителя, дарующего мир, газ, весну, металл, лето, хлеб, дождь.

Несчастным беженцам из воюющего Кавказа хорошо и покойно даже в чернобыльских деревнях, покинутых белорусами. Но честно ли сопоставлять факты не одного понятийного ряда? Болотной лягушке весьма комфортно в трясине. Покажите ее, президентские пропагандисты, по БТ, чтобы убедила белорусов: чем больше в государстве трясины, тем больше комфорта и счастья.

Молодые люди понимают, высмеивают и отвергают спекуляции предвыборной пиар-кампании белорусских властей и их "приводных ремней" — государственных журналистов. Однако читать эссе, приведенные выше, мне было тяжело. У кого из родителей не ноет сердце, когда он видит, что его ребенку грустно! Что это за отец и мать такие, если они пихают свое чадо туда, где ему страшно? Отец-мать такие — из Беларуси. Не впервой они проявляют жестокость и родительскую эгоистичность к родным детям.

***

В ноябре 1996 года на референдуме за новый вариант Конституции, предложенный президентом Лукашенко и установивший его безграничную власть, проголосовали 5.175.664 человека, или 70,45 процента избирателей. Это были внушительные цифры. И активные оппозиционеры, и пассивно симпатизирующие им демократы разных оттенков — все пребывали в шоке. Невозможно было умом понять, почему белорусский народ "проголосовал" ЗА ограничение собственных свобод и прав на многие годы вперед (Конституция — долгосрочный документ). Ситуацию в обществе после референдума 1996 года я попытался проиллюстрировать в правозащитной газете "Круг", которую редактировал.

В декабрьском номере "Круга" был помещен снимок, сделанный моим другом фотожурналистом Анатолием Коледой. Снимок занимал всю вторую страницу газеты. Фотосюжет у коллеги получился удачный, символический: на старом белорусском шляхе (брукаванцы), обсаженном вековыми деревьями, на мгновение остановилась маленькая бабка Тэкля, идущая на поле жать жито. Одета она в белую льняную кофту с вышивкой, на плече висит древний серп, на кофте пристегнуты (про запас) две большие булавки. Бабка Тэкля сложила на животе натруженные руки, стеснительно улыбается беззубым ртом, смотрит нам прямо в глаза. Подпись под снимком я сочинил вызывающую: "Счастливая!"

Почему же старушка показалась мне счастливой? Потому что бабки Тэкли не было среди 5.175.664 белорусов, добровольно отказавшихся от нормальной жизни. Да, она счастливая, хотя жизнь ее была тяжелая, беспросветная. Бабка Тэкля счастливая потому, что в ноябре 1996 года не участвовала в белорусском позоре — не выбрала себе и своим наследникам скотское существование. Ее внуки и правнуки, которым придется долго и тяжело выкорчевывать из своей жизни последки референдума-96, не будут ее проклинать, а вспомнят добрым словом, как принято вспоминать маму, бабушку, прабабушку...

Бабка Тэкля не участвовала в референдуме по той причине, что успела умереть до него.

Рафинированные теоретики журналистики периодически достают из домашних архивов газету "Круг" с фотографией бабки Тэкли и обвиняют меня в нарушении профессиональной этики. Мир праху вашему, бабка Тэкля! Простите меня, ее наследники, за то, что вынужден применять жесткий прием публицистики! Я по-прежнему считаю бабку Теклю счастливой: она не принимала участия и в референдуме 2004 года, на котором свыше 77 процентов белорусов отказались изменить свою жизнь к лучшему.

Морализаторство об этике неуместно вне исторического контекста, без учета конкретных реалий. А реалии — не утешают. Бабушки и дедушки и примкнувшие к ним папы и мамы средних лет в октябре 2004 года подтвердили, что не церемонятся со своими внуками и детьми, жаждущими перемен. Как объяснить сей парадокс наших безмерно любящих родителей, счастьем и целью которых является: родить детей, выучить, устроить, всю жизнь снабжать салом и бульбой, помогать пенсией, тянуть на буксире из последних старческих сил, проводить на заслуженный отдых, и продолжать снабжать салом и бульбой, и своей жалкой пенсией хоть немножко увеличивать их пенсию, такую же жалкую?

Все объясняется просто: нет никакого родительского парадокса. Есть консервативно-устойчивая патриархальная большая-пребольшая семья — белорусский народ. Данная семья подчиняется домострою, требующему беспрекословного повиновения главе. Домострою нужен диктатор-батька, который организует экономику и распределение труда в семье, устанавливает внутренние правила, учит жизни подрастающие поколения молитвой, тычком и личным примером, выбирает детям суженых, женит. И все делает с любовью и жестокостью. Благовещенский священник Сильвестр с умилением описал неприхотливое счастье патриархального жизнеустройства в классическом произведении русской литературы 16 века "Домострой", а мы наблюдаем оное в 21 веке во всебелорусской семье, где суровому отцу-удальцу безропотно прислуживает подловатая мамка — политическая технология, домашняя мастерица обмана, которая на референдуме сотворила процентов "даже больше, чем надо" (Лукашенко). Но фальсификации, грубейшие нарушения законов не смягчают вину стариков перед внуками. Более того, действия власти стали возможны благодаря безропотности подвластной паствы.

***

Домострой — прочная опора и надежный союзник государственного авторитаризма. В Великом княжестве Литовском домостроевские традиции пронизывали и связывали семью, государство, общество, церковь. 2 декабря 1591 года в ратуше Минска проходило обычное заседание городской рады. Неожиданно явилась группа городских ремесленников, а именно: золотых дел мастера, кузнецы, котляры, латунщики, слесари, часовщики, оружейники, ножевщики. Они пожаловались местным властям, что в Минске не разрешен цех ремесленников, который бы объединил всех мастеров единым уставом, как это сделано в столичном Вильно. Минские умельцы тоже сочинили устав, потребовали его немедленно прочитать и утвердить. Члены рады тут же изучили устав и, "хорошо уяснив себе его, приказали все необходимые статьи ... занести в городские книги".

Не могу удержаться от длинной цитаты из Устава минских ремесленников образца 1591 года, настолько он интересен, серьезен и... смешон:

"Ст.1. Мы, члены этого объединенного цеха, состоящего из 8 ремесел, желаем неустанно воздавать хвалу бессмертию божию, быть верноподданными милостивого е. вел. короля, оказывать почтение и повиноваться во всем как ему самому, так и его минскому магистру, чтить е. к. вел и его магистрат, не допускать по отношению к ним никакого ослушания, а, напротив, слушаться их во всем и подчиняться как своим старшим, поставленным богом...

Ст.3. Каждый человек каждого ремесла обязан удостоверить законность своего рождения свидетельством, основанным на показаниях под присягой людей, заслуживающих доверия. А тот, законнорожденность которого ставится под сомнение, не может ни заниматься каким-либо ремеслом, ни учиться в нашем цехе, ни находиться среди нас...

Ст.4. Стремясь к тому, чтобы ремесла нашего цеха снискали у всех славу и одобрение, устанавливаем, чтобы каждый, кто хочет с разрешения всего цеха стать мастером в г. Минске, собственноручно изготовил в присутствии 2 назначенных цехом для наблюдения мастеров нижеописанный шедевр...

Ст.5. Кузнечное ремесло: тесак, подкова, топор. Эти 3 предмета должны быть сделаны в 1 день и вчерне, с руки, т.е. с молота, отданы. А если бы указанные предметы не были сделаны удовлетворительно с первого раза, тогда, по усмотрению мастеров и цеха, он должен эти предметы делать второй и третий раз. Если и в третий раз он не справится, тогда становится бродячим ремесленником или подмастерьем, пока лучше не научится. Однако сыновей и дочерей мастеров мы освобождаем от этого... вменяя им в обязанность только устройство ужина, который они должны дать согласно обычаю. А если подмастерье этого ремесла женится на вдове или дочери мастера, тогда он обязан изготовить только половину шедевра и устроить ужин. Если же сын мастера женится на дочери мастера своего ремесла, он не должен выполнять никакого шедевра, а только устроить ужин...

Ст.7. Чтобы утолить печаль вдов, потерявших мужей-мастеров какого-либо ремесла, разрешается им на протяжении 1 года и 6 недель содержать подмастерьев в своей мастерской, чтобы избежать нищеты. А если у вдовы имеется потомство, а в особенности сын, тогда ей разрешается держать подмастерьев до тех пор, пока она не выйдет замуж либо пока не вырастет ее сын. Все это относится только к вдовам, благопристойно соблюдающим свое вдовство..."

Кудесники, а не ремесленники обитали в Минске! Как умело сплели в семейный клубок, казалось бы, не сочетаемое: бога, короля, минский магистрат, чинопочитание, высокомерие, профессиональное мастерство, жестокость, кумовство, вожделенный ужин, тотальный контроль, спальню вдовы...

***

Не с умельцев ли средневековья берут пример нынешние сочинители законов и указов, расписывающих каждый шаг и чих гражданина — предпринимателя, руководителя, специалиста? Не походит ли на Устав минских ремесленников наша Конституция, в 1996 году принятая народом и предоставившая право тотального контроля одному человеку в государстве? Не станет ли е. вел. Л. назначать дворников, учитывая нарекания народа на их неудовлетворительную работу? Если бы вопрос о назначении дворников по типу губернаторов, судей и руководителей предприятий вынести на республиканский референдум, он, несомненно, получил бы всенародную поддержку. Постулат о том, что народ — единственный источник власти, ограничен для Беларуси.

Желание регламентировать личную, общественную, духовную, профессиональную жизнь исходит в Беларуси и сверху, и снизу. Массовый родительский выбор на референдуме выдал затаенную авторитарность белорусского народа. Авторитарному народу позарез нужен повелитель — и таковой появился. Восхождение на белорусский Олимп Лукашенко обусловлено национальным менталитетом. Сам носитель этого менталитета, он грамотно использует его в политических целях, чем и побеждает несмышленых противников. Авторитарный же народ, с готовностью подчиняясь диктатору, диктует волю тем, кто слабее, беззащитнее, — своим детям.

А что же дети? Протестуя, что их без согласия "женили", мои юные друзья в своих рассуждениях не допускают грубых выпадов в адрес старших, не шлют им проклятий. Детям как зеленым отпрыскам народа свойствен психологический авторитаризм, то есть уважение к воле родителей. Мера такого уважения у молодых, безусловно, уменьшается под воздействием их антилукашизма, зачастую наивного, невыношенного. Так вынашивай, оппозиция! Однако при этом не позволяй себе полного неприятия батьки, признавай его определенные семейные заслуги, сотрудничай с ним избирательно, критикуй не огульно, не сей среди его домочадцев паники митинговыми воплями "долой!", встраивайся в родной народ, заряжай его протестным потенциалом.

Что же посоветовать мальчикам и девочкам, которым сегодня и страшно, и грустно, и уже злость одолевает? Пожалуй, это самый сложный вопрос, встающий перед обществом после референдума 2004 года. Проигравшая оппозиция, зная о протестных настроениях молодежи, с маниакальной настойчивостью будет призывать ее под свои знамена, чтобы повести в "бой с диктатурой". Но разве по-человечески — вступать в бой с родителями?

Молодые белорусы под воздействием остаточных всплесков врожденного авторитаризма отрицают роковой бой. Не следует ждать от молодежи оппозиционной активности, а призывать к таковой будет не по-отцовски. Революционная безоглядность — не семейное дело, не белорусский крест. Скорее всего молодежь станет приспосабливаться к ситуации, мимикрировать, искать благоприятную нишу, делать карьеру, барахтаться, уезжать, тосковать, спиваться...

Когда же Беларусь преодолеет в себе синдром Лукашенко? Не раньше, чем сменится поколение, и нынешние молодые станут большинством. Если им не помешает белдомострой, заложенный в генной памяти, заменяющий у нас гражданское общество. Если власть не успеет оболванить молодых, как оболванила старых.Или не произойдет чуда, в которое верят все дети.

Міністэрства ўнутраных спраў РБ папярэджвае: апазіцыйнасць небяспечная для здароўя

Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі будзе спыняць усе несанкцыянаваныя акцыі. "Будуць прымацца ўсе прадугледжаныя законам меры па забеспячэнні належнага грамадскага парадку і спыненні супрацьпраўных дзеянняў незалежна ад таго, кім ініцыіравана дадзенае мерапрыемства. МУС валодае дастатковай колькасцю сіл і сродкаў для захавання стабільнасці і спакою ў рэспубліцы", — гаворыцца ў афіцыйнай заяве міліцэйскага ведамства краіны, якая была распаўсюджана 19 кастрычніка ўпраўленнем інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС.

Падставай для з'яўлення такога дакумента паслужыла акцыя апазіцыі, праведзеная вечарам 18 кастрычніка ў Мінску. "Нягледзячы на тое, што дадзеная акцыя праводзілася з шэрагам парушэнняў законнасці, мітынгоўцы паводзілі сябе агрэсіўна і правакавалі ўзнікненне канфліктаў з міліцыяй, органы правапарадку актыўных дзеянняў па спыненні такога кшталту выпадаў не рабілі, — гаворыцца ў заяве МУС. — Ніводзін чалавек у органы ўнутраных спраў дастаўлены не быў. Удзельнікі мерапрыемства беспերашкодна змаглі не толькі правесці мітынг, але і прайсці па праспекце Ф.Скарыны. Каля дзевяці гадзін вечара мітынгоўцы разышліся. Ніхто не быў траўміраваны, зваротаў у медыцынскія ўстановы наконт гэтага не зафіксавана".

Вячаслаў БУДКЕВІЧ.

В.Леванеўскаму і А.Васільеву не далі выйсці з-за кратаў

19 кастрычніка калегія Гродзенскага абласнога суда пакінула ў сіле прыгавор, вынесены дзеячам прадпрымальніцкага руху Валерыю Леванеўскаму і Аляксандру Васільеву. Пра гэта БелаПАН паведаміў сын Валерыя Леванеўскага Уладзімір.

Паводле яго слоў, нягледзячы на тое, што хадайніцтва ўяўляла сабою 40 старонак тэксту, калегія разгледзела яго на працягу гадзіны. Суд таксама адхіліў хадайніцтвы Леванеўскага і Васільева аб іх асабістай прысутнасці на калегіі.

"Мы не зведвалі асаблівых ілюзій наконт рашэння калегіі. Цяпер мы будзем звяртацца ў Вярхоўны суд", — паведаміў Уладзімір Леванеўскі.

Нагадаем, што 7 верасня гэтага года суд Ленінскага раёна Гродна прыгаварыў Леванеўскага і Васільева да двух гадоў пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ў калоніі агульнага рэжыму. Суд таксама пастанавіў канфіскаваць на карысць дзяржавы ўсю тэхніку, што знаходзілася раней у падсудных. Апрача таго, В.Леванеўскі абавязаны выплаціць дзяржаве 643 тыс. рублёў у якасці кампенсацыі за праведзеныя падчас следства экспертызы.

Леванеўскі і Васільеў абвінавачаны ў знявазе прэзідэнта. Васільеў да таго ж абвінавачаны ў арганізацыі і актыўным удзеле ў несанкцыянаваным мітынгу 1 мая ў Гродне.

Генадзь ШАРЫПКІН.

Першая прышчэпка — хронікам

У Беларусі пачалася кампанія па вакцынацыі насельніцтва супраць грыпу.

Для гэтых мэт Міністэрства аховы здароўя Беларусі закупіла 600 тысяч доз вакцыны расійскай вытворчасці. У прыватнасці, для вакцынацыі дарослага насельніцтва набыта 450 тысяч доз, дзіцячага — 150 тысяч. Як і ў мінулыя гады, вакцына прызначана для бясплатнай імунізацыі насельніцтва.

У першую чаргу прышчэпкі ад грыпу атрымаюць дарослыя і дзеці з групы павышанай рызыкі, якія маюць шэраг хранічных захворванняў, а таксама пажылыя людзі, якім болей за 65 гадоў. Першачарговай вакцынацыяй будуць ахоплены дамы састарэлых, дамы інвалідаў і іншыя закрытыя калектывы.

Медыкі лічаць, што найбольш паспяховым часам для правядзення вакцынацыі з'яўляецца кастрычнік—лістапад, паколькі ў гэтым выпадку арганізм паспее выпрацаваць імунітэт супраць грыпу да наступлення эпідэміі.

Паводле звестак шматгадовых эпідэміялагічных назіранняў, эпідэмія грыпу ў Беларусі пачынаецца ў канцы студзеня — у лютым.

Вольга АСІПЕНКА.

Правакацыя!

Як няцяжка было прадбачыць,"наезд" на кандыдата ў дэпутаты Нацыянальнага сходу **Івана Уладзіміравіча АНТАШКЕВІЧА,** пра які пісала наша газета 15 кастрычніка, не спыніцца. Кандыдата "дацiснулі", выбілі з дыстанцыі на фінішнай прамой. Скажам адразу: тыя, хто гэта зрабіў, маральнымі прынцыпамі не абцяжараныя. Яны пайшлі на самую звычайную правакацыю. А ў акружкаме і Цэнтрвыбаркаме гэтага як быццам чакалі.

15 кастрычніка акруговая выбарчая камісія выкрасліла Анташкевіча са спісу кандыдатаў. Рашэнне патлумачылі тым, што нібыта давераныя асобы Івана Уладзіміравіча раздавалі выбаршчыкам агітацыйныя матэрыялы разам з газетай "Народная воля" за 6 кастрычніка, дзе было надрукавана інтэрв'ю з кандыдатам. На думку членаў акруговай выбарчай камісіі, Анташкевіч выкупіў частку накладу ў рэдакцыі, а значыць, выйшаў за межы грашовага ліміту, выдаткаванага на выбарчую кампанію, і раздаваў газеты з мэтай подкупу выбаршчыкаў. Пра гэта, маўляў, ёсць заявы абураных жыльцоў дома № 3 па вуліцы Прытыцкага.

Як на добры лад, дык тую камісію можна было б саму абвінаваціць у паклёпе на выбаршчыкаў, якіх нібыта можна купіць такім мізэрным хабарам (газета ў кіёску каштуе недзе 250 рублёў). Тым больш ніякіх доказаў, што раздавалі газеты менавіта людзі Анташкевіча, няма. Хлуснёй з'яўляецца і тое, што Анташкевіч выкупіў у рэдакцыі — мы гатовы пацвердзіць гэта дакументальна. Давераныя асобы кандыдата свой удзел у гэтай няўцямнай справе адмаўляюць. На пасяджэнні акруговай камісіі заявы, на падставе якіх Анташкевічу "шылі справу", ягоным давераным асобам на рукі не далі, толькі паказалі. Але тыя ўсё ж запомнілі некалькі адрасоў і прозвішчаў, каб асабіста пагаварыць з гэтымі пільнымі грамадзянамі.

Калі яны пайшлі па адрасах, дык высветлілася, што ніводны з жыхароў, ад імя якіх напісаны заявы, прыгаданага нумара газеты "Народная воля" ў вочы не бачыў, у руках не трымаў. А ў кватэры №24 ужо некалькі месяцаў ідзе рамонт, і суседзі гаспадыню, якая нібыта пісала заяву ў акруговую камісію, апошні раз бачылі не менш як два месяцы таму. У кватэры № 33, па словах суседзяў, ніхто не жыве ўжо паўгода. У кватэры №10 ніколі не чулі пра спадарыню Ганчарову, а ў заяве ў выбарчую камісію пазначана, што яна жыве па гэтым адрасе.

Гэтыя звесткі былі перададзены ў Цэнтральную выбарчую камісію, дзе іх папросту праігнаравалі. У нас хапае іншых лістоў і званкоў, — заявілі Анташкевічу.

Іван Анташкевіч сабраў нямала галасоў падчас папярэдняга галасавання. У нядзелю выбаршчыкі былі вельмі здзіўленыя, пабачыўшы ягонае прозвішча выкрасленым з бюлетэня. Жыхары выбарчай акругі, пазбаўленыя магчымасці аддаць Анташкевічу свае галасы, зараз тэлефануюць яму. Кажуць, каб не спыняў барацьбу, абяцаюць падтрымку.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ.

ЖЫЦЦЁ ЯК ЯНО ЁСЦЬ

Чаму фермеру прыйшлося «паказаць зубы»...

У знаёмага фермера пад Мінскам — моцная і прыбытковая гаспадарка. Ён вырошчвае пераважна бульбу, даволі многа — ранняй, на якой заўсёды можна добра "падняцца". Акупіць выдаткі і мець прыбытак. Насенне ў яго элітнае, галандскага паходжання, ураджаі высокія. Хаця, канешне, круціцца прыходзіцца з ранку да позняга вечара, летам — практычна без выхадных. Сваё ёсць сваё. Вось толькі з нейкага часу ўзнікла адна праблема.

Справа ў тым, што палі размешчаны побач з ажыўленай аўтатрасай, якая вядзе прама ў сталіцу. Зноў жа, мясціны тут дачныя. Дачныя пасёлкі размешчаны ледзь не праз кожныя 5—6 кіламетраў. Адпаведна, праязджае мноства螺рознага народу, як вы разумееце, пераважна беларускага. І гэты народ раз-пораз спыняецца ля бульбяных палеткаў і пачынае "нарыхтоўваць" бульбу. Прычым абсалютна спакойна. Часцей гэта здараецца надвячоркам, калі на палях ужо нікога няма.

Вось так аднойчы мой фермер ішоў вечарам уздоўж сваіх палёў і ўбачыў такую карціну: адразу ў некалькіх месцах "шчыруюць" 3—4 каманды. Як кажуць, у фермера "взыграло ретивое" і ён злодзеяў пагнаў. Потым арганізаваў назіранне.

Хтосьці з работнікаў курсіраваў уздоўж поля з "мабільнікам" у кішэні. Як толькі заўважаў "несанкцыянаванае ўмяшанне", тэлефанаваў гаспадару, выязджалі некалькі чалавек і наводзілі парадак. Пару разоў прыйшлося выклікаць міліцыю. Толькі так праязджаючыя асэнсавалі той факт, што вось гэта зямля чыясьці, і ўсё, што на ёй расце, таксама камусьці належыць.

— Што мяне абурыла да глыбіні душы, — расказваў фермер, — дык вось што. Я падыходжу да гэтых людзей, не магу слова вымавіць, а адзін мне кажа: ну чаго стаіш, капай, тут на ўсіх хопіць!

Дарэчы, цікавы псіхалагічны феномен. Аказваецца, людзі лічылі гэтую бульбу калгаснай. А калі так, то можна красці. Пры гэтым яны нават не лічылі, што крадуць, а проста бяруць тое, што дрэнна ляжыць. Вось гэта мая кватэра, мой дом, мая гаспадарка, і калі ты, нягоднік, надумаеш карыстацца маёй маёмасцю, то тваё месца ў турме. Ну, а калі зямля, то яна агульная, належыць усім і нікому. Украсці агульнае — амаль доблесць, украсці чыёсьці — грэх.

За гады савецкай улады наша псіхалогія змянілася вось такім чынам. Яна проста перарадзілася ў нешта незразумелае. Калі гіены спрабуюць адабраць у льва яго здабычу, леў паказвае клыкі: гэта маё. Фермер таксама "паказаў зубы", і народ хутка разабраўся, дзе чыё.

Да заходняга разумення катэгорыі прыватнай уласнасці нам яшчэ далекавата. Хаця нічога страшнага, думаю, няма: гэтаму разуменню вучацца хутка. Праўда, для падобнага трэба, каб прыватных уласнікаў стала многа і каб іх паважалі. Па-першае, дзяржава, а потым і грамадзяне, якія прывыклі арыентавацца менавіта на дзяржаву. Дзяржава ўжо пачала разумець, што прыватнае не ёсць абавязкова злачыннае. Людзі таксама пачнуць разумець.

Што датычыцца мяне, то я гэта зразумеў яшчэ гадоў пятнаццаць таму.

Сяргей ШАЎЦОЎ.

ЧТО ПРОИСХОДИТ В МИРЕ

На северо-западе Москвы столкнулись 14 автомобилей



Поздно вечером на северо-западе Московской кольцевой автодороги в районе 69-го километра произошло дорожно-транспортное происшествие с участием 14 автомобилей, передает интернет-издание "Газета.Ru" со ссылкой на агентство "Интерфакс". Как рассказали в ГУВД Москвы, по предварительным данным, около 23.50 водитель трейлера, двигаясь по внутреннему кольцу МКАД, потерял управление машиной, что и привело к крупному ДТП. В результате нескольких столкновений пострадали пять человек, четверо из них были госпитализированы, а одному медицинская помощь оказана на месте.

Care International приостанавливает работу в Ираке

Международная гуманитарная организация Care International заявила, что приостанавливает работу в Ираке после того, как в Багдаде была похищена Маргарет Хасан, которая руководит деятельностью этой гуманитарной организации в Ираке.

Катарский телеканал "Аль-Джазира" ранее показал интервью с Тасином Али Хасаном — мужем захваченной, который рассказал, что супругу похитили рядом с офисом ее организации. Две машины заблокировали автомобиль Маргарет Хасан, похитители выбросили из кабины водителя и уехали с ней в неизвестном направлении. Маргарет Хасан родилась в Ирландии, замужем за иракцем и живет в стране уже 30 лет. Она руководит деятельностью гуманитарной организации Care International в Ираке. Британский премьер-министр Тони Блэр осудил это похищение и заявил, что правительство страны "сделает все возможное", чтобы помочь своей соотечественнице. "Я думаю, что это показатель того, с кем нам приходится бороться — то, что они готовы похищать таких людей", — сказал он.

Выборы в США: в ход пошли прививки

Нехватка в США вакцины против гриппа превратилась в фактор предвыборной борьбы между кандидатами в президенты демократом Джоном Керри и республиканцем Джорджем Бушем.

Каждый год в США в среднем умирают от гриппа 36 тыс. человек. Как заметила газета "Лос-Анджелес таймс", если в этом году из-за дефицита антигриппозной вакцины умрет хотя бы на одну десятую больше, то число жертв превысит число убитых 11 сентября 2001 года. Серьезной вспышки гриппа пока еще нет, но тысячи пожилых людей, принадлежащих к одной из главных групп риска, нервничают и выстраиваются в очереди за прививками. Министр здравоохранения США Томми Томпсон призвал стариков не волноваться раньше времени. "Сезон гриппа еще не начался", — заметил он, а на следующий день объявил, что к январю страна получит еще 2,6 млн. доз вакцины от ее производителя Aventis Pasteur.

Сенатор Керри начал атаку на этом фронте 5 октября, когда власти объявили о нехватке, и с тех пор повторяет нападки почти на каждом предвыборном митинге, хотя, как отметила "Вашингтон пост", не предлагает конкретной программы предотвращения будущих дефицитов. Когда сенатор высказал эти обвинения во время последнего теледиспута с Бушем, тот ответил, что в нехватке вакцины прежде всего виноваты судебные иски, которые отбили у фармацевтических компаний охоту ее производить. Буш обвинил Керри в том, что он голосовал в сенате против попыток обуздать эпидемию сутяжничества.

Дефицит образовался потому, что в начале месяца британские власти временно аннулировали лицензию ливерпульской корпорации Chiron на производство вакцины от гриппа, поскольку нашли ее продукцию недоброкачественной. Если в 1967 году в США было 26 изготовителей вакцин, то сейчас их всего четыре, и ни один из них не хочет связываться с вакциной от гриппа, опасаясь разорительных судебных исков. Поскольку вместе с Керри баллотируется в вице-президенты юрист Джон Эдвардс, сделавший миллионы на исках против больниц и врачей, то газеты пишут, что если Керри ищет виновных в дефиците на вакцину, то он может легко найти одного рядом с собой.

Керри продолжает возлагать вину на Буша и язвительно спрашивает на митингах, как тот собирается защитить американцев от биологического оружия, если он не в состоянии обеспечить их вакциной от гриппа.

Новый китайский спутник будет контролировать треть поверхности Земли

Во вторник Китай запустил в космос новый спутник. Он будет собирать метеорологические данные, следить за температурой мирового океана, измерять солнечную и космическую радиацию, а также поможет отслеживать стихийные бедствия — ливни, песчаные бури, пожары.

Эхо белорусского референдума

Политический фурункул Европы

Германская газета **"Лаузитцер рундшау"** пишет:

"Никого не удивляет, что некий Лукашенко добился от своих белорусов некой лицензии на долгую жизнь в качестве диктатора. Да и на Западе это мало кого интересует. Несмотря на то, что Беларусь является самой западной частью бывшего Советского Союза и обладает населением численностью в добрые 10 миллионов человек, западные средства массовой информации ее упоминают редко. А ведь эта страна является политическим фурункулом для всей Европы и потенциальным источником инфекции для всего континента.

Да и для соседней России и ее президента Путина, тоже подумывающего об изменении Конституции, Беларусь является плохим примером. ЕС уже предпринимал робкие попытки изолировать режим в Минске. Серьезных же изменений может добиться только Россия, от которой зависит Лукашенко. Так что действенная стратегия правительств западных стран заключается в том, чтобы в диалоге с Москвой указать на проблемы, связанные с диктатурой в Беларуси. Правительство Германии к этому не готово. Оно, как и в случае с чеченской войной, надеется, что конфликт урегулируется сам собой".

«Внук Сталина» на границе ЕС

Испанская "Паис" называет белорусский референдум "фарсом, который Европа и остальной мир не должны были допустить". "И теперь этот фарс превращается в трагедию, чреватую настоящими проблемами для Европы, которая должна сказать "нет" этому внуку Сталина", — призывает газета.

Президент Лукашенко, считает газета, "видит свое спасение в союзе с Россией". "Но когда Москва смотрит в белорусское зеркало, она видит свое отражение", потому что "безоговорочное одобрение" Кремлем результатов референдума "показывает, что защита демократии не фигурирует в списке приоритетов президента Владимира Путина", — пишет газета.

Американская газета **"Нью-Йорк таймс"** называет это голосование "постыдным". "Александр Лукашенко, этот деспотичный президент Беларуси и бывший председатель колхоза, формально не является коммунистом, однако на воскресных выборах он руководствовался старыми правилами. Лукашенко не стал даже дожидаться закрытия избирательных участков, чтобы объявить о своей победе и потребовать от Запада придержать свою критику для себя. Многие бывшие советские республики переживают тяжелые времена, и многие из них поддались соблазну подчиниться сильному правителю. Но даже в таком окружении Лукашенко оказался особенно наглым в выборе сталинских методов. Запад обязан поощрять граждан Беларуси стремиться к лучшей системе правления".

Театр манипуляций

Австрийская газета **"Прессе"** в комментарии на эту же тему высказывает такое мнение:

"Президент Лукашенко в очередной раз продемонстрировал, что ему абсолютно безразлично, что западный мир думает о его абсурдных инсценировках. Рецепт Лукашенко примитивен: он просто отрицает очевидные факты, зарегистрированные наблюдателями в его театре манипуляций. Но что можно поделать в XXI веке с политиком, который создает свою собственную реальность, который не служит своему народу, а требует от населения раболепного подчинения и которому даже нравится находиться в положении изгоя? Западный мир не знает ответа на этот вопрос. А десяти миллионам белорусов, судя по всему, еще долгое время придется прозябать в автократическом рабстве".

Эдуард АГУНОВІЧ:

«Сёлетняе Свята беларускага пісьменства — гэта прафанацыя нацыянальнай культуры»

17 кастрычніка сярод іншай прапагандысцкай прадукцыі па Беларускім тэлебачанні круцілі ролік пра росквіт нацыянальнай культуры. Зрэшты, звычайная агітка, зробленая пад канкрэтную падзею (ведаем мы, які ў нас росквіт!), але некаторыя меркаванні, якімі быў агучаны відэарад, падаліся мне не пазбаўленымі сэнсу. Напрыклад, тое, што Дні беларускага пісьменства сталі чыннікам не толькі культурніцкага, але і эканамічнага развіцця мясцін, дзе яны ладзяцца. Зразумела, калі ўзяць ад кожнага, з усёй краіны, а падарыць аднаму, канкрэтнаму гораду, — дык яму будзе добра. Але я вітаю ўжо сам факт усведамлення ўладаю той акалічнасці, што культура пры разумным да яе стаўленні можа быць не цяжарам для эканомікі, а прыбытковым прадпрыемствам. Іншая рэч, наколькі эфектыўна скарыстоўваюцца ў рэгіёнах сродкі на культуру, выдаткаваныя з нацыянальнага бюджэту. Пра гэта і пра іншае наша гаворка з Эдуардам Агуновічам, мастаком-графікам і экспазіцыянерам.

— Эдуард Канстанцінавіч, адкрыццё для наведвальнікаў адрэстаўраванай і рэканструяванай часткі Гомельскага палаца Румянцавых—Паскевічаў падчас сёлетніх Дзён беларускага пісьменства стала падзеяй не гарадскога ці рэгіянальнага, але нацыянальнага маштабу. Да гэтай працы Вы мелі непасрэднае дачыненне. Вы задаволены вынікам?

— Адносна. Над праектам прыстасавання палаца пад музей я працую некалькі год. І музей там, скажу я вам, можа быць шыкоўны. У ягоных фондах — больш за 80 тысяч адзінак прадметаў археалогіі, нумізматыкі — больш за 9 тысяч, ёсць этнаграфія, народнае мастацтва, іканапіс, прыстойная калекцыя жывапісу, графікі, скульптуры. Я прапанаваў мясцоваму кіраўніцтву канцэпцыю музейнай экспазіцыі, якая дазваляла адлюстраваць усю гісторыю Палесся ад з'яўлення на гэтай зямлі чалавека да нашых дзён — увесь цывілізацыйны шэраг. Ад пачатку гэта была мая прыватная ініцыятыва, але потым я працаваў на дзяржаўную замову.

Гомельшчына, Прыдняпроўскае Палессе — гэта мая радзіма. Я родам з Рэчыцы. Для роднага горада я спланаваў капліцу-помнік у гонар Святой Еўфрасінні Полацкай, а вось для Гомеля вырашыў распрацаваць канцэпцыю музея.

Летась, калі Гомельшчыне прызначылі прымаць Свята пісьменства, мясцовая ўлада нарэшце звярнула на маю працу ўвагу, я афіцыйна стаў галоўным распрацоўшчыкам, кіраўніком праекта. Мяне нават сталі прыспешваць. Моцна прыспешваць. Маўляў, рабі хутчэй — час падціскае. Але чым бліжэй да рэалізацыі маёй ідэі, тым меней у ёй заставалася майго.

— У чым гэта выявілася?

— На рэстаўрацыю і рэканструкцыю былі выдаткаваныя немалыя грошы. Іх павінна было хапіць на тое, каб адрадзіць былую прыгажосць у яе сапраўдных формах. Але як дайшло да справы, пачалася "эканомія". Скажам, паркет было запланавана рабіць у лекальных формах (як яно было пры гаспадарах — Румянцавых—Паскевічах), а зрабілі "шашачкамі". Гэта самае простае і таннае, што можна сабе ўявіць. Зэканомілі і на Калоннай зале. Навукоўцы вызначылі, што калоны ад пачатку былі мармуровыя, і было запланавана аднавіць іх у гэтым каштоўным матэрыяле. Але ў выніку калоны зрабілі пафарбаванымі пад мармур, як у калгасным клубе. На мае пратэсты быў адказ, што няма грошай...

— Вы не пацікавіліся, куды ж яны падзеліся?

— Я здагадваюся. Дарэчы, мая праца як галоўнага распрацоўшчыка канцэпцыі і кіраўніка праекта была аплачана толькі часткова. Чалавек з абласной адміністрацыі, прыстаўлены да аўтарскага калектыву ў якасці, так бы мовіць, заўхоза, старанна даводзіў нам, што ён тут галоўны, і ягонае прозвішча абавязкова мусіць быць у ганарарнай ведамасці, прычым — у першым радку. Гэта, дарэчы, з ягонай падачы паркет "шашачкамі" і замест мармуру — камуфляж "пад мармур".

— Наколькі я разумею, у гэтай рабоце Вамі рухаў найперш патрыятызм, а ўжо потым матэрыяльны інтарэс?

— Так. На маю думку, роля беларускага Прыдняпроўя ў культурніцкай гісторыі Еўропы дагэтуль не асэнсаваная. Хрысціянізацыя ішла на нашай зямлі з поўдня на поўнач, з Кіева ўверх па Дняпры. У Прыдняпроўскім Палессі ў сярэднявеччы склалася моцная цывілізацыя, хрысціянская зместам, але з элементамі язычніцкай архаікі. Я маю падставы сцвярджаць, што менавіта тут напісана "Слова аб палку Ігаравым", і менавіта Кірыла Тураўскі быў ягоным аўтарам. Я думаў пра ўсё гэта, калі браўся за працу.

— Скажыце, Эдуард Канстанцінавіч, а зала прыёмаў з партрэтамі выбітных асоб Гомельшчыны — Ваша ідэя?

— Мая. Але скажоная да непазнавальнасці. Я прапанаваў партрэтную галерэю культурніцкіх дзеячаў, якія ўславілі гэты край. Прыклаў спіс. Чаму культурніцкіх, а не палітычных? Таму што культура вечная, а палітыка зменлівая. Аднак са спісу быў выкраслены шэраг асоб — Насовіч, Доўнар-Запольскі, Раманаў. Мележ... Іх замянілі на партыйных функцыянераў савецкай пары і ваенных начальнікаў Вялікай Айчыннай.

Да таго ж гэтая партрэтная галерэя бачылася мне як шырокае прадстаўленне сучаснага беларускага мастацтва. Сярод аўтараў мне хацелася бачыць найперш тых, хто родам з гэтых краёў. Алеся Марачкіна, Зою Літвінаву, Мікалая Казакевіча — недзе з дзесятак мастакоў. Але атрымалася так, што працу падзялілі паміж сабою Віктар Альшэўскі, Уладзімір Савіч, Уладзімір Зінкевіч. І толькі адзін партрэт (Кірылы Тураўскага) перапала зрабіць Гаўрылу Вашчанку.

— А калі ў Вас пачаліся праблемы з замоўцамі?

— Мабыць, пачалося з таго, што я, азнаёміўшыся з планам святкавання Дня беларускага пісьменства, выказаў шэраг крытычных заўваг.

— Чаго канкрэтна яны датычыліся?

— Найперш я параіў не ставіць эстраду на тым месцы, якое вызначылі арганізатары, і ўвогуле перанесці скокі і песні за межы Замкавай гары, за гарадзішча.

— Якая Ваша матывацыя?

— Справа ў тым, што эстраду планавалі паставіць (і, зрэшты, паставілі) на старажытным некропалі, на тым месцы, дзе пахаваныя тураўскія князі. Тут пад зямлёю шэсць саркафагаў. Было восем, але два зараз у музеях — тураўскім і пінскім. Я сказаў, што нельга ладзіць скокі на касцях. Пасля гэтага я трапіў, так бы мовіць, у няміласць.

— Я хацеў яшчэ запытаць Вас пра экспазіцыю, разгорнутую на другім паверсе Гомельскага палаца. Да яе дачыненне маеце?

— Фактычна не маю. Спяшаліся, і таму на грунтоўную, канцэптуальна вывераную экспазіцыю часу не было. Зрабілі часовую з таго, што падвярнулася пад руку. З прадметаў мастацтва, затрыманых мытняй, і іншых выпадковых рэчаў. Але ёсць небяспека, што часовае на неакрэслены час стане пастаянным. У маёй практыцы мастака-экспазіцыянера такіх выпадкаў безліч.

— Мы віталіся з Вамі на Свяце пісьменства, але не здарылася запытаць пра Вашы ўражанні аб гэтай імпрэзе...

— Кепскія ўражанні. Што "Дажынкі", што Свята пісьменства, усё ладзіцца па адным сцэнарыі. Як пайшло яно ад "Базара", так і доўжыцца. Справа ў тым, што наша краіна на гэтых "базарах" прадстаўляецца на чыста фальклорным узроўні. А фальклор — гэта толькі падмурак культуры. Фальклор і рускамоўная папса — вось, уласна кажучы, і ўвесь рэпертуар. На свяце панавала руская мова. Ад арганізацыі і ўдзелу былі адхіленыя ГА ТБМ і Саюз пісьменнікаў. Гэта не клопат пра Беларусь, гэта прафанацыя нацыянальнай культуры. Дарэчы, хоць я лічуся аўтарам канцэпцыі экспазіцыі Гомельскага музея, галоўным мастаком праекта, я не меў афіцыйнага запрашэння на Свята і прысутнічаў там як прыватная асоба.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ.

Здымак з архіва: *беларуская экзотыка — спецназ МУС на Свяце беларускага пісьменства. Заслаўе ,2000 г.*

Фота photo.bymedia.net

У СОСЕДЕЙ

Вотум в тени Алганова,

или Как в польском сейме пытались свалить правительство Марека Бельки



Сейм предоставил вотум доверия правительству Марека Бельки. За его принятие проголосовали 234 депутата, против 218, никто не воздержался. Само обсуждение проходило довольно бурно.

Оппозиция хотела перенести голосование по вотуму доверия до момента выявления материалов спецслужб, касающихся встречи самого богатого поляка Яна Кульчика с Владимиром Алгановым. Польский бизнесмен вроде бы сослался на встрече на президента, который должен был облегчить россиянам приватизацию Гданьского нефтезавода. Президент опроверг сообщение о том, что он давал полномочия Кульчику, а он сам утверждает, что ничего такого не говорил. Депутаты оппозиции хотели выяснения этого дела еще до голосования.

Вообще-то дело это запутанное, наделало много шуму в Польше и смакуется в печати. Особенно после информация о якобы пятимиллионной взятке для тогдашнего министра госказны взамен за согласие на продажу Гданьского нефтеперерабатывающего комбината российскому концерну "Лукойл". Польские СМИ утверждают, что такую информацию якобы получил Ян Кульчик от российского агента Алганова летом 2003 года.

Известно, что российский концерн "Лукойл" выступал как партнер фирмы "Ротч", которая получила исключительные права на переговоры по покупке Гданьского нефтеперерабатывающего комбината. Это было в апреле 2002 года. Россияне предложили 275 млн. долларов за 75%-ный пакет акций. Летом Веслав Качмарек, тогда министр госказны, говорил, что предложение "Лукойла" и "Ротча" заманчиво, но политически рискованно. Министр не уточнил, о каком риске идет речь. Но пошли слухи, что согласие на покупку 75% акций россиянами второго по величине нефтеперерабатывающего комбината в Польше будет зависеть не столько от министра, сколько от премьера и президента. Одновременно появились опасения, что "Лукойл" в Гданьске может привести к трагедии на польском рынке горючего и многомиллионным потерям в самом Орлене. Эти аргументы звучали для правительства настолько убедительно, что оно дало возможность отечественному ПНК "Орлен" стартовать в тендере на покупку гданьского нефтеперерабатывающего комбината. Корректировка программы привела к тому, что "Ротч" отказался от российского партнера, заменив его на ПНК "Орлен". Сейчас всем этим занимаются соответствующие службы. Используя это, оппозиция и пыталась свалить правительство.

Премьер Марек Белька определил действия оппозиции во время дебатов по вотуму доверия как попытку дестабилизации государства. При этом он заверил, что все материалы, связанные со встречей Кульчика с Алгановым в Вене в 2003 году, будут рассекречены. Пока же надо дать специалистам выяснить все обстоятельства.

Разговоры в сейме выплеснулись на страницы газет. "Вотум в тени Алганова", "Триумф Алганова", "Конец президентства", "Алганов не прошел" — таковы только некоторые заголовки польской печати после бурного заседания сейма. Выдержки из статей передало Польское радио.

"Обычно, когда правительство получает вотум доверия в парламенте, это повод для удовлетворения и облегчения. Ибо это сулит установление политического спокойствия и дает кабинету полнейшую возможность выполнения программы, — пишет в "Жечпосполитой" Кшиштоф Готтесман. — Однако к правительству Марека Бельки это правило не подходит". Получение кабинетом вотума доверия — это, по мнению комментатора газеты, проявление болезни сейма и политического класса, который в своем большинстве, хотя имеет минимальную общественную поддержку, выше ставит сохранение в своих руках власти и укрывание любой ценой компрометирующей действительности, нежели благо государства и его оздоровление. А это могут принести только проведенные как можно скорее выборы и создание нового стабильного политического уклада, пишет комментатор "Жечпосполитой".

